**З. Канапацкая**

## Прававое становішча татар у Вялікім княстве Літоўскім у XV-XVI стагоддзях паводле Статутаў 1529, 1566, 1588 гг.

Прававое становішча татар у ВКЛ, пачынаючы з XV стагоддзя, рэгламентавалася шэрагам заканадаўчых дакументаў і прававых актаў. Спачатку гэта былі прывілеі вялікага князя, якія выдаваліся на права валодання зямлёй. Самы старажытны акт, у якім згадваюцца землі, падараваныя татарам, знаходзіцца ў кнізе Запісаў Літоўскай метрыкі №4 і датуецца 1392 годам.[1, с. 296]

Калі ваеннаслужачыя татары, якія мелі зямлю і татары, якія жылі ў гарадах і мястэчках, добраахвотна ішлі на вайну, яны ў сваіх правах прыраўноўваліся да шляхты, а іх надзелы вызваляліся ад падаткаў. У кнізе Судовых спраў Літоўскай метрыкі №3 знаходзіцца прывілей Жыгімонта І ад 1516 г., які вызваляў ад серабшчызны ўсіх татар, якія "едут" на вайну з умовай што яны ў замен за гэта адправяць "тым часам" 100 коней на воінскія патрэбы без усялякай аплаты.[2, с. 1162-1163]

Згодна рэвізіі Яна Кердзея ў 1631 годзе татар, якія не былі запісаны ў татарскія харужаствы, было не болей 5 тысяч. [3] Усе яны павінны былі плаціць пагалоўны падатак за сябе і за сваю сям'ю. Судзіліся простыя татары як мяшчане, так як у 1457 годзе былі прыраўнаваны да іх, разам з астатнім насельніцтвам гарадоў. [4]

У 1496 годзе татарам, нароўне з шляхтай, было дадзена права на пастаянае і неад'емнае валоданне зямлёй. Яны таксама мусілі набываць, прадаваць, абменьваць сваі надзелы, але толькі са згоды вялікага князя. [5, с. 111] З 1569 года., пасля Люблінскай уніі, усе земскія валодання сталі спадчыннымі. Аднак, літоўскія князі пастаянна падкрэслівалі, што найвышэйшае права над татарскімі землямі належыць да "гаспадара" і патрабавалі ад татар атрымання згоды на права продажы падараванных зямель. Нягледзючы на гэта, з дакументаў XVI ст. відаць, што гаспадарскія татары свабодна распараджаліся сваімі землямі. Менавіта гэта стала прычынай таго, што з часам большасць татарскіх уладанняў перайшло ў рукі літоўскіх феадалаў.

Такім чынам, беларускія татары ў прававом становішчы прыраўноўваліся да шляхты. Выключэннем было тое, што яны не мелі права займаць дзяржаўныя пасады і прымаць удзел у пасяджэннях літоўскіх соймаў. Гэта не было сур'ёзным абмежаваннем для татар, калі улічваць, што ў некаторых справах яны карысталіся самакіраваннем. [6, с. 1644; 7, с. 277] А. Мухлінскі адзначае, што шляхетства татар прызнавалася законамі і ўладамі дзяржавы. [7, с.465-467] Афіцыяльна шляхецкія правы татар былі пацверджаны дзьвума прывелеямі Жыгімонта Аўгуста 1561 і 1568 гг., затым прывілеямі Стэфана Баторыя (1576), Жыгімонта ІІІ (1609), Уладзіслава IV (1634) і астатніх правіцеляў[8, с. 146-150, 152-154, 154-158, 159-161], а таксама шматлікімі канстітуцыямі літоўскіх соймаў.

У XVI стагоддзі завяршыўся працэс фарміравання прававой сістэмы Вялікага княства Літоўскага. Яна засноўвалася на мясцовым традыцыйным праве, нарматыўных актах дзяржаўных органаў краіны, сеймавых пастановах, вялікакняжацкіх прывілеях і граматах, пастановах павятовых сеймікаў і г.д.

Дэталевае вывучэнне пісьмовых крыніц сведчыць аб існаванні юрыдычных катэгорый і груп татар у ВКЛ. Гаспадарскія татары, якія служылі вялікаму князю, з'яўляліся самай прывілеяванай групай. Яны адстойвалі свае правы, дабіваліся іх пашырэння, а затым паступова гэтыя прывілеі распаўсюджваліся і на іншыя катэгорыі татарскага насельніцтва. Сярод гаспадарскіх татар вылучаліся нашчадкі залатаардынскай знаці (вярхушка), якія захавалі арыстакратычныя тытулы (царэвічы, уланы, князі, мурзы) і манапалізаваную ваенна-адміністрацыйную ўладу ў сцягах, а таксама простыя дробныя землеўладальнікі. З пункту гледжання літоўскага права ўсе яны складалі адну саслоўную групу і карысталіся агульнымі прывілеямі, замацаванымі спачатку мясцовым правам (звычаем), а пасля заканадаўчымі актамі Вялікага княства Літоўскага.

Сацыяльны статус розных катэгорый і груп ВКЛ акрэсліваўся ў закандаўчых дакументах, у прыватнасці, у актах, вызначаўшых ступень абароны іх жыцця, здароўя, гонару. З часоў Кіеўскай Русі ў заканадаўстве ВКЛ захоўваліся грашовыя штрафы за забойства, раненне, за знявагу асобы. Іх памер адпавядаў сацыяльнаму статусу. Самы высокі вызначаўся для шляхты, аднолькавы для дробных землеўласнікаў і для буйных феадалаў, што падкрэслівала іх прыналежнасць да аднаго прывілеяванага саслоўя.

Нормы традыцыйнага права замацаваў Літоўскі Статут 1529 года. У артыкулах, дзе гаворка ідзе аб галоўшчынах (грашовае пакаранне за забойства) і навязках (штрафах за раненне і абразу), татары не ўпамінаюцца. Але, з юрыдычнай практыкі вядомы такія спагнанні са служылых татар, што тлумачыцца іх прыналежнасцю да шляхты ВКЛ. [9, с. 47; 5, с. 112] Напэўна, гэта было відавочна для складальнікаў Статута, і таму ў гэтых артыкулах няма спецыяльных агаворак адносна татар, як і адносна іншых катэгорый літоўскай шляхты.

Без спецыяльных заўваг распаўсюдзіліся на татар і астатнія артыкулы Статута, у прыватнасці, аб парадку доказу шляхецтва на судзе. Гаспадарскія татары, нароўні з мясцовай шляхтай Вялікага княства, павінны былі пры неабходнасці даказваць сваё шляхетнае паходжанне. Пры гэтым выкарыстоўваліся звычайныя доказы: паказанні сведак, службовых асоб, часам, у адпаведнасці з агульналітоўскай практыкай, існаваўшай у адносінах да выхадцаў з іншых дзяржаў, сведчанні, атрыманыя з краіны, дзе жылі іх родзічы. Так, шляхецтва ў Ардзе, засведчанае крымскім ці казанскім ханам, з'ўлялася дастатковай умовай да прысваення татарыну адпаведнага становішча ў Літве. [10, с. 180, 246]

Існуе дакумент, які адносіцца да такога рода пацверджання шляхецкага паходжання літоўскага татарына. Гэта ліст Жыгімонта ІІІ ад 6 марта 1595 года, які пацверджваў па просьбе князя Кшыштафа Радзівіла ліст Жыгімонта Аўгуста (датавана ў Вільні 26 красавіка 1557 года). З другога ліста відаць, што да Жыгімонта І звярнуліся татары Віленскага ваяводства Багдан, Міска і Ардзюшка Тахтамовічы ад свайго імя і ад імя "братоў" сваіх Каражычаў са скаргай, што татары таго ж павета Габіль Нарковіч "прыганіў Міску гонар", сказаўшы нібы, нібы ён "просты чалавек, а не шляхціц". Па загаду караля іх справу разбіраў царэвіч Азюбек Солтан (з крымскага роду) які жыў у Літве. Ён добра ведаў гэтую сям'ю, але дадаткова звярнуўся за даведкамі да крымскага пасла, і той засведчыў: "… род у Ардзе ёсць Карачы-Кіпчак, княжацкі, добры, а яны з таго роду". Ліст, выдадзены Азюбека братам, быў занесены ў кнігі Літоўскай метрыкі. З дакумента вынікала, што ў іх карысць мае быць навязка па двадцаць рублёў грошай, як іншай шляхце, і ніхто надалей не павінен ім і іх нашчадкам "на гонар прыганіць".[11, с. 233-234, 237] Такіх судовых спраў даволі шмат.

Статут 1529 года ўтрымлівае шэраг артыкулаў, накіраваных супраць татар. Найбольш важнай з'ўляецца змешчаная ў адным з іх пастанова, якая забараняла татарам любога саслоўя валодаць (раздзел 12, артыкул 5) нявольнай чэляддзю, куляць або браць пад заклад такіх людзей. [5] Пры гэтым нявольныя, набытыя навечна або народжаныя ад купленай навечна жанчыны, мусілі адрабіць у гаспадара сем гадоў, а па заканчэнні тэрміна станавіліся свабоднымі. Узятыя пад заклад павінны былі адпрацаваць тую суму, прычым год працы залічваўся за 30 грошай. Але адначасова падкрэслівалася, што калі "татары адтрымалі ад гаспадара нашага або ад продкаў нашых разам з іншымі дварамі і нявольную чэлядзь, то яны могуць валодаць ёю вечна".[9, с.49]

Згаданы артыкул быў даволі супярэчлівы, так як з аднаго боку, за татарамі нібы прызнавалася пажыццёвае права валодаць нявольнай чэляддзю, а з другога – ім забаранялася самім набываць яе. Гэта супярэчнасць была заканамернай, паколькі феадальнае заканадаўства, якое абараняла інтарэсы пануючага класа, не магло пазбавіць частку феадалаў, якія карысталіся традыцыйнымі правамі (у прыватнасці, правам валодаць зямлёй з залежнымі сялянамі, у тым ліку і нявольнай чэляддзю), іх льгот, не закранаючы агульных прывілеяў пануючага класа. Таму такая мера, прадыктаваная, перш

за ўсё, рэлігійнымі поглядамі складальнікаў Статута 1529 года, мела на мэце перашкодзіць толькі іншаверцам (у тым ліку і татарам), у далейшым набываць хрысціян у няволю.

Згодна з адным з артыкулаў Літоўскага Статута 1529 г. забаранялася прымаць у судзе сведчанні татар па зямельных справах (раздзел 8, артыкул 5). Гэта было другім важным абмежаваннем, якое абумоўлівалася рэлігійнай прыналежнасцю. Складальнікі Статута 1529 года стварылі найбольш спрыяльныя ўмовы для шляхты ў зямельных справах, а татар, спавядаючых адрозную ад іх рэлігію, разглядалі, як не заслугоўваючых даверу ў якасці сведак. С. Думін адзначаў, што пры гэтым далёка і не ўсе хрысціяне маглі карыстацца гэтым правам: "дзеля таго трэба было кожны год спавядацца, карыстацца добрай славай у акрузе і г.д."[9, с.49]

У 1566 годзе ўводзіцца новы Статут. У ім не было ўлічана многіх гістарычна абумоўленых асаблівасцей дзяржавы і асобных правоў некаторых груп насельніцтва, у прыватнасці беларускіх татар. Іх колішнія льготы абмяжоўваў, напрыклад, артыкул, які аб'яшчаў, што "татарын і кожны бусурманін" не мусяць абірацца на дзяржаўныя пасады: ці "на достоинство и ни на который вряд от нас, господаря, ани от панов рад наших предложон не был и христиан в неволи не держал" (раздзел 12, артыкул 5). Такім чынам, захавалася старая забарона для татар набываць хрысціян у няволю. Яна паўтаралася з дапаўненнямі: забаранялася пад страхам смерці на кастры звяртаць закупных хрысціян у сваю веру і не дазвалялася браць хрысціянак карміцелькамі для сваіх дзяцей (раздзел 12, артыкул 6). Акрамя таго, калі вялікі князь дараваў маёнтак з сялянамі каму-небудзь з татар ("бусурман"), апошнія не маглі прымушаць сялян да новых службаў і плацяжоў, а як тыя сяляне сыходзілі з зямлі, вяртаць іх не мелі права. Зноў, як і ў Статуце 1529 года, татарам забаранялася сведчыць у судзе па зямельных справах (раздзел 9, статья 3).

Няглездзячы на абмежаванні. Статут 1566 года замацаваў і некаторыя гістарычна сфарміраваныя прывілеі татарскай шляхты, у прыватнасці, нароўні з літоўскімі дваранамі з іх спаганяліся галоўшчына і навязка. Тады ж была акрэслена мяжа паміж служылымі татарамі і непрывілеяванай часткай іх супляменнікаў у Вялікім княстве.

Нарэшце, згодна Статуту 1566 года татары "земское именье и лета зупольные маючы", павінны былі служыць у войску, "водле уфалы земское соймов Вяликаго Князства" (раздзел 2, артыкул 1).

Татары былі не задаволены абмежаваннямі Статута і звярнуліся са скаргай да Жыгімонта II Аўгуста, які прыхільна да іх ставіўся, аб чым таксама сведчыць у 1558 годзе невядомы аўтар трактата аб беларускіх татарах "Risale-I-Tatar-I-Leh" (гаворачы аб каралі з павагай, ен адзначаў яго верацярпімасць).[12, с.263]

7 верасня 1566 года ў Любліне Жыгімонт Аўгуст прыпыніў спецыяльным цыркулярам дзеянне 5-га артыкула 12-га раздзела і даручыў пры разглядзе судовых спраў татар нават да выпраўлення Статута кіравацца яго прывілеям.

"Папраўай" Статута заняўся Гродзенскі сейм 1568 года. Татары зноў нагадалі аб сваёй просьбе, якую Жыгімонт II Аўгуст улічыў і 20 ліпеня 1568 года выдаў ім на сейме прывілей. Гэты дакумент адмяняў у адносінах да служылых татар дзеянне артыкулаў, што супярэчылі іх правам і вольнасцям, "от предков и от господаря им нададеных".[13, с.129; 12, с. 149-150]

З 1568 года права служылых татар сведчыць у судзе нароўні са шляхтай больш не аспрэчвалася і было затым пацверджана наступным Статутам.

Статут 1588 года канчаткова абагульніў і сістэматызаваў заканадаўства Вялікага княства Літоўскага. Ен быў падрыхтаваны на высокім тэарытычным узроўні кваліфікаванымі прававедамі таго часу пад кіраўніцтвам канцлера А.Б. Валовіча і падканцлера Л.І. Сапегі. Гэта быў адзін з самых дасканалых прававых збораў Еўропы, прасякнуты ідэямі прававой дзяржавы, рэфармацыі і верацярпімасці. Складзены на тагачаснай беларускай мове, якая была афіцыйнай мовай Вялікага княства Літоўскага, Статут вытрымаў некалькі перавыданняў (у тым ліку на польскай мове).

Значным здабыткам дзяржаўнага права ВКЛ было ўключэнне ў Статут акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г., які абвяшчаў свабоду веравызнання (раздзел 2, артыкул 1).Але нягледзячы на прагрэсіўнасць многіх палажэнняў Статута, ён насіў саслоўны характар, што было абумоўлена нормамі таго часу. Статут канчаткова акрэсліў мяжу паміж татарамі. З аднаго боку называюцца "мурзы, князи, татарове закону бусурманского мають оседлость, службах наших господарских и земских в ротах, або при гетманах наших, - в реестрах военных суть написаны". З другога боку, адзначаюцца тыя "татарове", якія "фурлюном (фурманствам – К.З.) се живять и огородные речи справуют, быдлом торгуют, кожу дубят и якими колвек ремеслы жывность собе зароблывают". Першая група прыроўнівалася да шляхты, а другая – да простых татар (мяшчан). Статут зноў забараняў абіраць (назначать) татар "на достоинство и ни на который врядъ" (раздзел 12, артыкул 9). Не дазвалялася трымаць нявольных хрысціян, адзначаючы пры гэтым, што татарскія нявольнікі "мають быти осаживаны на их (татар) землях" (раздзел 12, артыкул 21). Пад страхам спальвання на кастры забаранялася не толькі схіляць хрысціян да "бусурманскай веры", але і спрабаваць зрабіць гэта. Статут не дазваляў татарам заключаць шлюбы з хрысціянкамі і трымаць для сваіх дзяцей карміцеляк-хрысціянак. Аднак на працягу XVI стагоддзя шлюбы паміж татарамі і хрысціянамі, ращуча асуджаныя царквой, працягвалі заключацца, прычым татары жаніліся і на шляхцянках. Трымалі яны і чэлядзь, і карміцеляк-хрысціянак, аб чым з абурэннем паведамлялася ў працах каталіцкіх аўтатарў пачатку XVII стагоддзя.

Астатнія правы татар, замацаваныя ў ранейшых заканадаўчых дакументах (у першым і другім Статутах і прывілеях Жыгімонта II Аўгуста), у Статуце 1588 года былі сфармуляваны дастаткова традыцыйна. Нязменнымі заставаліся штрафы - навязка і галоўшчына, крытэры памеру для якіх з'яўлялася прыналежнасць да ўказанай групы (наяўнасць зямель і воінскай службы). Тым самым акрэсліваліся ўмовы дачынення асобнай катэгорыі татар Вялікага княства да прывілеяванай іх часткі – да татарскай шляхты, супрацьпастаўленай у многіх актах ужо ў пачатку XVI стагоддзя "простым" татарам. Гэта таксама адлюстравалі артыкулы другога і трэцяга Статутаў Вялікага княства Літоўскага, якія замацоўвалі памеры галоўшчыны і навязкі служылых татар, бо вызначалі навязку татарам-рамеснікам і гандлярам у 60 разоў меншую, чым у служылых татар, а галоўшчыну – у 5 разоў.

Статут 1588 года ў адпаведнасці з каралеўскімі прывілеямі прызнаваў права сведчыць у судзе нароўні са шляхтай толькі за служылымі татарамі: "на всякую реч у каждого суда мають быти припущоны ку сведецтву и татарове тые, которые на службу нашу военную ездять, яко то в привилью продка нашого писано мають" (раздзел 4, артыкул 76). У справах адносна ўладання зямлёй, у адрозненні ад двух першых рэдакцый Статутаў, мелі магчымасць сведчыць і татары, "только б были люди добрые, цнотливые и веры годные". У адносінах да другіх татар, "которые привильями, им надаными, не суть припущоны до вольности шляхетское, розсудок чынен быти маеть водлугналепшего баченья своего, прихиляючыся чым ближэй ку справедливости" (раздзел 9, артыкул 14). Да такіх татар належылі ў першую чаргу татары, якія жылі ў гарадах.

Нароўне з гарадскімі татарамі былі і другія групы татар, чый сацыяльны статус адрозніваўся ад статуса татарскай шляхты. Напрыклад, тыя, хто валодаў зямлёй феадалаў (у тым ліку і сваіх татарскіх) на правах путных і панцырных баяр, а менавіта, ваеннаслужачых сялян, што акрамя службы ў час вайны ў атрадзе землеўладальніка выконвалі і некаторыя іншыя феадальныя павіннасці на яго карысць. Такія татары ўпамінаюцца ў матэрыялах рэвізій татарскіх двароў у 30-я гады XVII стагоддзя. [14]

Некаторыя трымалі на баярскай службе і дзяржаўныя землі (у староствах, пры замках). Але далёка не ўсе татары, якія служылі тым або іншым феадалам, маглі быць прылічаны да сялян-слуг. У XVI-XVII стагоддзях і пазней частка дробнай шляхты з асабістых войск буйных феадалаў, знаходзячыся ў эканамічнай і палітычнай залежнасці ад іх, не страціла свайго саслоўнага статуса. Аб роўнасці у правах гэтай катэгорыі татар з

гаспадарскімі татарамі сведчыць шэраг заканадаўчых дакументаў таго часу. Так, польскімі каралямі Янам III Сабескім і Аўгустам II у XVII ст. былі выданы прывілеі, якія пацвярджалі прывілеі татар, якія жылі ў літоўскіх князёў.[11, с. 41] С. Думін адзначае, што татары ахвотна пастуралі на службу да магнатаў дзеля таго, каб атрымаць параўнальна вялікі надзел, знайсці абарону ад другіх магнатаў і захаваць свае саслоўныя правы.[9, с. 27]

Такім чынам, літоўскае заканадаўства абараняла правы і прывілеі татарскага насельніцтва, іх жыццё і маёмасць. Аднак у апошнім варыянце Статута быў замацаваны шэраг абмежаванняў правоў нехрысціянскага насельніцтва Вялікага княства. Дарэчы, самі па сабе абмежаванні па рэлігійнаму прынцыпу не мелі рашаючага значэння. Важнейшым з'яўлялася пазбаўленне татар-мусульман, нават татарскай шляхты, доступу да прывелеяў, заваяваных для сябе ў сярэдзіне XVI стагоддзя шляхтай хрысціянскага веравызнання. Татар не заносілі ў склад так званага шляхецкага павета – павятовай саслоўнай арганізацыі шляхты. Нягледзячы на тое, што з таго часу іх справы разглядаліся ў шляхецкіх земскіх (і каралеўскіх гарадскіх) судах, хоць з шляхецкім паветам яны былі звязаны ў падатковых адносінах, захаванне адасобленай ваеннай арганізацыі і асобных прынцыпаў выканання воінскай службы аддзяляла іх ад астатніх землеўладальнікаў, у тым ліку і ад бліжэйшых суседдзяў. Акрамя таго, адсутнасць у татар-мусульман выбарчых правоў на шляхецкім сейміку не давала ім магчымасці актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці (яны дзейнічалі толькі з дапамогай петыцый, праз дэпутатаў, выбраных хрысціянскай шляхтай). Тым не меньш, прававое становішча татар у Вялікім княстве Літоўскім пры вялікім князе Вітаўце і пад час праўлення дынастыі Ягелонаў увогуле было здавальняючым, і адносіны гэтай дзяржавы да іншаверцаў – прадстаўнікоў той рэлігіі, з якой на працягу ўсяго сярэднявечча, ды і пазней, хрысціянская Еўропа вяла жорсткую барацьбу, - робяць гонар і каралям, і ўраду, і правячаму саслоўю княства.

**Літаратура:**

1. Danilowich. A. Skarbiec dyplomatow papiezkich, krolewskich, ksiazecych … poslugujacych do krytycznego wyjasnienia dziejow Litwy, Rusi Litewskiej I osciennych im krajow. – Wilno, 1860-1862. – T. I.
2. Русская Историческая Библиотека – Спб., 1912.- книга XX – №442.
3. Акты Литовской Метрики. Книга переписей №12.
4. Акты Западной России. – Т. I - №61.
5. Bartoszewicz L. Poglad na stosunki Polski z Turcja I tatarami na dzije tatarow w Polsce osiadlych. – Warszawa, 1860.
6. Довнар-Запольский М.В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягелоннах. – Спб., 1902 – С. 1644; Лаппо И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-русский повет и его сеймик. – Юрьев, 1911.
7. Лаппо И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569-1586) – Спб., 1801. – Т. I.
8. Muchlinski A. Zdanie sprawy o tatarach litewskich // Teka Wilenska. – Wilno, 1858. – nr.6.
9. Думін С., Канапацкі І. Беларускія татары. Мінулае і сучаснасць. – Мн., 1993 – с.47; Bartoszewicz L. Poglad na stosunki Polski z Turcja I tatarami. – Warszawa, 1912.
10. Акты, издаваемые Виленской археологической комиссией. – Вильно, 1865-1912. – Т. XXXI.
11. Kryczynski S. Bej barski // Rocznik Tatarski - №2 Warszawa, 1935.
12. Muchlinski A. Zdanie sprawy o tatarach litewskich // Teka Wilenska. – Wilno, 1858. – nr.4.
13. Литовская Метрика. Книга записей № 89, С. 129; Muchlinski A. Zdanie sprawy o tatarach litewskich // Teka Wilenska. – Wilno, 1858. – nr.6.

14. Российский государственный архив древних актов. Ф.389.. "Rewizya dobr tatarskich w Wielkim X. Lit. …przez Jana Kierdeja pisarza ziemskiego Oszmianskiego skonczona A. D. 1631".